Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 8. Варыянт 4. Ч.4**

**Білет № 8. Наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны**

**Распрацоўнікі заданняў:**Герасімовіч Сяргей Міхайлавіч, ДУА "Ленінская сярэдняя школа Бабруйскага раёна"
Дашкоўская Наталля Святаславаўна, ДУА «Навучальна - метадычны кабінет Бабруйскага раёна»

**Пытанні:**

1. З апорай на крыніцы №1 і №2 дайце азначэнне паняцця «гета». З якой мэтай яны ствараліся і які лёс іх жыхароў? (2 узровень)
2. З апорай на крыніцу №3 вызначыце, што сімвалізуюць адлюстраваныя на ілюстрацыях помнікі і мемарыяльныя комплексы? (3 ўзровень)
3. З апорай на крыніцу №3 укажыце, які з помнікаў прысвечаны людзям, якія ў час Вялікай Айчыннай вайны дапамагалі яўрэям. Як называюць такіх людзей? (4 ўзровень)
4. Сфармулюйце рысу акупацыйнай палітыкі, адлюстраваную ў крыніцах. Выкажыце свае адносіны да яе. (5 ўзровень)

**Крыніца 1:**Бабруйскае гета.

З першых жа дзён акупацыі Бабруйска гітлераўцы ўвялі ў адносінах да яўрэяў цэлы шэраг дыскрымінацыйных мер. Акрамя ўсеагульнага абавязку выконваць каменданцкую гадзіну, яўрэям было асабліва забаронена знаходзіцца "па-за межамі свайго месца жыхарства", а таксама іх прымусілі насіць нашыўкі жоўтага колеру.

У ліпені 1941 г. быў арганізаваны юдэнрат, які з'яўляўся адным са спосабаў адчужэння яўрэяў ад астатняга насельніцтва. Навязаны акупантамі орган кіравання гета спачатку размяшчаўся на вуліцы Пушкінскай і складаўся з 12 чалавек, узначальваў яго рабін Е. Розенберг. Першым абавязкам юдэнрата стала рэгістрацыя яўрэяў - адно з мерапрыемстваў акупантаў, якое дазваляла атрымаць поўную інфармацыю аб яўрэях Бабруйска. Акрамя таго, юдэнрат займаўся размеркаваннем на працу і ўладкаваннем бежанцаў. Нацысты таксама патрабавалі ад юдэнрата выплачваць «кантрыбуцыі», забіраючы праз яго ў габрэяў грошы, золата, каштоўнасці і футры.

Наступны этап нацысцкай праграмы генацыду габрэяў прадугледжваў іх ізаляцыю ў асобным раёне горада. Аб'ява аб абавязковым перасяленні яўрэяў у гета з'явілася 1 жніўня 1941 г. Частка мясцовага насельніцтва адразу пачала раскраданне пакінутай безгаспадарнай яўрэйскай маёмасці. Некаторыя яўрэі спрабавалі ўцячы, таму працэс поўнага перасялення заняў больш за 10 дзён. Гета было створана ў межах вуліц Новашасейнай, Затурэнскага і Баброва. Бабруйскае гета было "закрытага тыпу", гэта значыць яно было абгароджана, ахоўвалася і выхад з яго забараняўся.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца 2.**З кнігі Івана Хімічова «У барацьбе і трывозе» (І. Хімічоў. У барацьбе і трывозе. – Мінск, 1977).

«…Гэта адбылося напярэдадні кастрычніцкіх свят. Уначы над горадам пранёсся град. На досвітку моцна пахаладала. Лужыцы вады зацягнуліся тонкай ледзяной плёнкай. Па вуліцах горада, расцягнуўшыся доўгай калонай, пад узмоцненай аховай эсэсаўцаў ішлі вязні габрэйскага гета. Сэрца сціскалася ад болю, калі мы глядзелі на гэтае журботнае шэсце, на гэтых людзей, якія ішлі на кару. Яны ведалі, што ідуць у свой апошні шлях. Але трымаліся цвёрда. Маладыя падтрымлівалі старых. Маці неслі на руках сваіх малютак, дзеці старэйшыя ішлі побач. І была ў гэтых людзях не асуджанасць, не пакорлівасць свайму лёсу, а высокая чалавечая годнасць. Яны ішлі моўчкі. Па тварах многіх жанчын цяклі слёзы, але не выцiралі іх, а толькі яшчэ мацней прыціскалі да сябе сваіх маленькіх, якія таксама маўчалі дзяцей. Толькі чулася шорганне сотняў і сотняў падэшваў па бруку.

Эма (дачка доктара Вольфсана) ішла аб руку з бацькам. Як жа вы памыляліся, дарагі доктар, наіўна верачы, што фашысты лекараў не крануты!

Іх вывелі за горад, туды, дзе вось ужо два тыдні яны капалі, як ім патлумачылі фашысты супрацьтанкавы роў. На краі гэтага рова ўсіх і паставілі. Яны стаялі, узяўшыся за рукі, і глядзелі на сваіх катаў. Немцы мітусіліся каля кулямётаў...».

**Крыніца 3.**Помнікі і мемарыяльныя комплексы на тэрыторыі Бабруйска і Бабруйскага раёна: Брацкая магіла ў Яловіках, Мемарыяльны комплекс на месцы растрэлу каля в. Слабодка, мемарыяльны комплекс «Алея праведнікаў свету», мемарыяльны знак «Вязням Бабруйскага гета».









